УДК 9(476)

# ТРАГЕДЫЯ ВАЎКАВЫСКАГА ЯЎРЭЙСТВА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫНАЙ ВАЙНЫ

Міронь Д.В., БНТУ
кіраўнік: канд.гіст.навук, дацэнт Багдановіч А.Г.

Мэтай майго даследавання было паказаць, якім складаным было жыццё ваўкавыскіх яўрэяў у часы акупацыі, праз якія пакуты і цяжкасці ім прыходзілася праходзіць. У аснову даследавання пакаладзены ўспаміны Міры Якаўлеўны Каплінскай.

Ваўкавыская абшчына яўрэяў напярэдадні вайны складала 14 тысяч чалавек з 24 тысяч насельніцтва горада.

27 чэрвеня 1941 г. у горад увайшлі фашысты. Пачалася акупацыя. 2 лістапада 1942 г. усіх яўрэяў выселілі з іх квартала ў лагер, за спробу ўцячы жорстка каралі. У канцы лістапада фашысты пачалі адпраўляць эшалоны з яўрэямі ў Трэблінку з яе знакамітымі крэматорыямі.

Некаторыя жыхары Ваўкавыска дапамагалі яўрэям. У наш час Ізраільская дзяржава такім людзям прысвойвае ганаровае званне "Праведнікі Свету", у іх гонар у Іерусаліме пасаджана Алея Праведнікаў. У тым парку расце дрэва і ў гонар нашага земляка – Навасада Аляксандра Барысавіча.

У пачатку 1943 г. у лагеры засталося 5 тыс. яўрэяў з Ваўкавыска. Аднак разразіўся тыф, і фашысты ліквідавалі ачаг хваробы - знішчылі апошніх яўрэяў Ваўкавыска. Здарылася гэта 26 студзеня 1943 г. - 800 апошніх яўрэяў адправілі на знішчэнне ў Асвенцым. Так была знічтожана адна з самых вядомых яўрэйскіх абшчын Беларусі.

Выжылі толькі адзінкі з іх, ваўкавыскіх яўрэяў. Сярод іх Міра Якаўлеўна Каплінская. Ёй удалося ўцячы з работы, а Навасад А.Б. схаваў яе амаль на 450 дзён у склепе. 14 ліпеня 1944 г. Ваўкавыск быў вызвалены. А 7 чэрвеня 1998 г. быў уручаны знак Праведніка Свету Аляксандру Барысавічу пасмяротна.

10 красавіка 2001 г. перастала біцца сэрца Міры Якаўлеўны Навасад-Каплінскай, апошняга кавалачка вялікай яўрэйскай сям'і Ваўкавыска.